**УДК 94(476)"1894/1897"**

# ПАДРЫХТОЎКА І ЎВЯДЗЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ «ВІННАЙ» МАНАПОЛІІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ (1894–1897 ГГ.)

*Мяньчэня С. В.*
Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

*Артыкул прысвечаны мерапрыемствам расійскіх улад па падрыхтоўцы і ўвядзенні дзяржаўнай «віннай» манаполіі на тэрыторыі беларускіх губерняў. Асвятляюцца такія пытанні, як асноўныя задачы рэформы, становішча алкагольнага рынка напярэдадні рэформы і змены ў ім, роля яўрэйскага фактара, адмена права прапінацыі і арганізацыя папячыцельстваў аб народнай цвярозасці.*
*Ключавыя словы: дзяржаўная манаполія; папячыцельствы аб народнай цвярозасці; гандаль алкаголем.*

# PREPARATION AND INTRODUCTION OF THE STATE «WINE» MONOPOLY ON THE TERRITORY OF THE BELARUSIAN PROVINCES (1894–1897)

*Mianchenya S. V.*
Belarusian State Agrarian Technical University, Minsk, Belarus

*The article is devoted to the measures taken by the Russian authorities to prepare and introduce a state "wine" monopoly in the Belarusian provinces. The author considers such questions as the situation of the alcohol market on the eve of the reform and changes in it, the role of the Jewish factor, the abolition of the right of propination and the organization of trusteeship of public sobriety.*
*Keywords: state monopoly; trusteeship of public sobriety; alcohol trade.*

Сістэма рэгулявання продажу і спажывання алкагольных напояў у Расійскай імперыі ў XIX ст. прайшла некалькі этапаў развіцця: сістэма водкупу, акцызная сістэма і дзяржаўная манаполія.

Да 1863 г. існавала сістэма водкупу, а ў заходніх і паўднёвых губернях мела месца фактычна поўная свабода вырабу і продажу спірта. Сістэма водкупу была адменена ў 1863 г. дзякуючы моцнаму антыалкагольнаму руху 1859–1861 гг., які, пачаўшыся з Ковенскай губерні, у хуткім часе перакінуўся і на тэрыторыю Беларусі [1, с. 1; 2, с. 3]. Новая акцызная сістэма абкладала падаткам спірт-сырэц на вінакурнях, рабіла магчымым гандаль спіртам і гарэлкай пры пакупцы патэнта ў дзяржавы, уводзіла дзяржаўны кантроль за месцамі вытворчасці, а затым і продажу спіртных напояў.

Акцызная сістэма мела для дзяржавы важнае фінансавае значэнне. З 1863 па 1894 г. піцейны падатак на душу насельніцтва павялічыўся з 1,87 да 2,47 руб. [1, с. 5]. Дынаміку даходаў бюджэту ад акцызнай сістэмы можна

прасачыць па даных, якія прыводзіць у сваім даследаванні М. Фрыдман (табліца).

*Табліца*

**Даходы бюджэту Расійскай імперыі і спажыванне алкаголю ва ўмовах акцызнай сістэмы (1865–1894 гг.)** [3, с. 64–65]

| Перыяд | Даход дзяржавы (сярэдні паказчык за год, у млн руб.) | Спажыванне гарэлкі на душу насельніцтва (сярэдні паказчык за год, у вёдрах 40°) |
|---|---|---|
| 1865–1869 | 126,7 | 0,89 |
| 1870–1874 | 174,9 | 0,86 |
| 1875–1879 | 202,0 | 0,77 |
| 1880–1884 | 238,4 | 0,72 |
| 1885–1889 | 251,1 | 0,58 |
| 1890–1894 | 269,4 | 0,50 |

Па-за статыстыкай заставаўся нелегальны рынак, памеры якога штогод павялічваліся. У канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XIX ст. было зафіксавана ўзнікненне вялікай колькасці патаемных корчмаў, што і паспрыяла зніжэнню спажывання паводле афіцыйнай статыстыкі [3, с. 85]. Адбываўся рост беспатэнтнага гандлю і звязаных з ім правапарушэнняў. Магілёўская, Віленская і Ковенская піцейныя камісіі паведамлялі, што на 4503 патэнтныя карчмы прыходзіцца 11 133 беспатэнтныя карчмы. Сітуацыю з беспатэнтным продажам у Магілёўскай губерні вызначалі наступным чынам: «Можно с уверенностью сказать, что в каждой деревне, на всех перекрёстках, на постоялых дворах, в лесных месностях, одним словом везде, где сколько нибудь выгодно, производится беспатентная продажа питей» [3, с. 86].

Бескантрольны продаж гарэлкі прыватнымі асобамі прыводзіў да злоўжыванняў: гарэлка прадавалася ў пазыку, за рэчы і прадукты, у любы час дня і ночы [1, с. 9–10]. Акрамя пашырэння п’янства, беспатэнтны рынак аказаў уплыў і на даходы дзяржавы ад акцызнай сістэмы, рост якіх значна запаволіўся. Сістэма патрабавала рэфармавання, што прывяло да ідэі рэалізацыі дзяржаўнай віннай манаполіі.

Дзяржаўная «вінная» мапанолія ў Расійскай імперыі трымалася на наступных тэзісах:

1. Увесці манаполію на рэктыфікацыю для паляпшэння якасці гарэлкі. Спірт, які выпрацоўваецца на прыватных заводах, закупляецца дзяржавай на конкурснай аснове.

2. Адхіліць ад піцейнага гандлю прыватны сектар, які зацікаўлены ў прыбытках і імкнецца да павелічэння аб’ёму продажу, стварыць сістэму дзяржаўных вінных крам.

3. Ліквідаваць прыватныя піцейныя ўстановы, якія гандлююць выключна гарэлкай. Стварэнне прыватных піўных крам, рэнскіх паграбоў і корчмаў магчыма толькі пры пакупцы патэнта. Пры наяўнасці некалькіх прэтэндэнтаў праводзіцца конкурс.

4. Далей распаўсюджваць вынасны гандаль на карысць хатняга спажывання.

5. Увесці планавую сістэму арганізацыі сістэмы продажу алкаголю. Колькасць устаноў, якія маюць права прадаваць спіртныя напоі і піва, абмяжоўваецца трохгадовым планам.

6. Узмацніць кантроль за продажам як манапольнай гарэлкі, так і іншых алкагольных напояў.

7. Арганізаваць папячыцельствы аб народнай цвярозасці, асноўнай мэтай якіх з'яўляліся б кантроль за ажыццяўленнем рэформы, тлумачэнне насельніцтву карысці ўмеранага спажывання гарэлкі і арганізацыя здаровага вольнага часу [1, с. 13–15].

Мэты рэалізацыі дзяржаўнай «віннай» манаполіі ў Расійскай імперыі на самай справе былі звязаны з неабходнасцю барацьбы з п'янствам і нелегальным рынкам, які спрыяў як распаўсюджванню п'янства, так і фінансавым стратам дзяржавы. Гэта неаднаразова падкрэсліваў і сам міністр фінансаў С. Вітэ. Выданне Міністэрства фінансаў, прысвечанае першым вынікам манаполіі, адзначала, што ўзнікненне манаполіі звязана з разуменнем эканамічнай шкоды п'янства як прычыны збяднення насельніцтва, яго неплацежаздольнасці і зніжэння ўзроўню прадукцыйнасці працы [1, с. 7–8; 3, с. 185]. На думку расійскага даследчыка А. Мікалаева, курс на цвярозасць і фарміраванне негатыўнага стаўлення да п'янства ва ўмовах манаполіі можна растлумачыць тым, што дзяржава асцерагалася супраціўлення прыватных вытворцаў, а таму спрабавала заручыцца падтрымкай насельніцтва [4, с. 16]. Рэформа закранала фінансавыя інтарэсы значнай колькасці людзей – уладальнікаў вінакурняў, піваварaнных заводаў, гаспадароў піцейных устаноў і г. д., сярод якіх былі і ўплывовыя асобы. Многія з іх ці ўвогуле пазбаўляліся сваіх прыбыткаў, ці аказаліся ў новых умовах.

Для рэалізацыі рэформы пры Міністэрстве фінансаў было створана Галоўнае ўпраўленне неакладных збораў і казённага продажу піцей. Улічваючы маштаб мерапрыемстваў і вялікія фінансавыя выдаткі на рэалізацыю манаполіі, яе пашырэнне вялося паэтапна. 6 ліпеня 1894 г. манаполія была ўведзена ў чатырох усходніх губернях – Арэнбургскай, Пермскай, Самарскай і Уфімскай [3, с. 187]. Афіцыйны ўзровень спажывання алкаголю тут быў самы нізкі па краіне – 0,35 вядра на душу насельніцтва. У той жа час тут назіраўся і найбольшы росквіт нелегальнага гандлю [5, с. 470]. 11 ліпеня 1894 г., не чакаючы папярэдніх вынікаў, распачалася падрыхтоўка да ўвядзення манаполіі ў губернях з яўрэйскім насельніцтвам. М. Фрыдман прыводзіць цытату з дадзенай пастановы, зацверджаную асабіста Аляксандрам III: «казённая питейная монополия даст возможность совершенно изъять торговлю питьями из рук евреев и таким образом послужит решительным шагом на пути к освобождению местного христианского населения из-под еврейской зависимости, и чем скорее будет устроена казённая продажа питей, тем больше выиграет население» [3, с. 187]. 29 ліпеня 1894 г. на падрыхтоўку рэформы ў 25 губернях мяжы аселасці быў выдаткаваны 1 млн руб. Акрамя яўрэйскага фактара, імкненне ўлад распаўсюдзіць манаполію на заходнія і паўднёвыя губерні можна патлу-

мачыць тым, што тут была сканцэнтравана пераважная колькасць вінакуранных заводаў.

2 мая 1895 г. Дзяржаўны савет зацвердзіў рашэнне аб паступовым увядзенні манаполіі і падзеле губерняў мяжы аселасці на тры чаргі: 1 ліпеня 1896 г. – паўднёвыя і паўднёва-заходнія, 1 ліпеня 1897 г. – паўночна-заходнія і Смаленская, 1 студзеня 1898 г. – Царства Польскае [3, с. 188].

Адным з падрыхтоўчых этапаў увядзення «віннай» манаполіі на тэрыторыі беларускіх губерняў стала адмена права прапінацыі. Упершыню права прапінацыі было замацавана сеймавай пастановай 1496 г. як права бязмытнага гандлю алкагольнымі напоямі ў маёнтках [6, с. 48]. Тэрмін «прапінацыя» – «частаваць віном» – быў распаўсюджаны ў Польшчы і нават увайшоў у польскую мову (дзеяслоў «propinowac») [6, с. 142]. Асноўны сэнс права прапінацыі заключаецца ў выключным праве ўладальніка маёнтка на вытворчасць і гандаль моцнымі напоямі. Прапінацыя прыносіла значны прыбытак землеўладальнікам і спрыяла распаўсюджванню броварства. Часам уладальнікі захоўвалі дадзенае права нават пасля продажу ці закладання маёмасці. На момант падрыхтоўкі «віннай манаполіі» правам прапінацыі карысталіся землеўладальнікі Царства Польскага, заходніх, прыбалтыйскіх і Бесарабскай губерняў, але распаўсюджвалася яно толькі на маёнткі і прыватныя мястэчкі. Вясковая прапінацыя была адменена 19 лютага 1864 г. на падставе Загаду аб арганізацыі побыту сялян [6, с. 185].

29 красавіка 1896 г. Дзяржаўны савет адмяніў права прапінацыі. Асобы і арганізацыі, якія карысталіся гэтым правам, павінны былі на працягу шасці месяцаў падаць заяву аб жаданні атрымаць кампенсацыю, яшчэ шэсць месяцаў давалася на падрыхтоўку і падачу дакументаў. Падставай для атрымання кампенсацыі з'яўляліся арыгінальныя граматы і акты, якія замацоўвалі за ўладальнікам маёнтка выключнае права продажу ў ім напояў; купчыя на маёнткі, якія даказвалі, што нерухомасць была набыта разам з правам прапінацыі; іпатэчныя кнігі, якія мелі запіс аб тым, што ўладальнік, страчваючы нерухомасць, захаваў права прапінацыі. У ліпені 1897 г. дадзенае рашэнне было апублікавана спачатку ў сталічных, а затым і ў губернскіх ведамасцях [7, арк. 1; 6, с. 319]. Для разгляду спраў ствараліся губернскія прапінацыйныя камісіі, у склад якіх уваходзілі губернатар, віцэ-губернатар, губернскі дваранскі прадвадзіцель, старшыня акружнога суда, упраўляючыя казённай палатай, дзяржаўнай маёмасцю, кантрольнай палатай, акцызнымі зборамі, член губернскага па сялянскіх справах прысутствія і два прадстаўнікі ад землеўладальнікаў [8, арк. 139].

Гродзенская губернская прапінацыйная камісія разгледзела ў 1897 г. 39 спраў аб выплаце кампенсацый і толькі ў двух выпадках вынесла адмоўнае рашэнне [8, арк. 29–34]. Сума кампенсацыі адрознівалася ў залежнасці ад памераў даходу ўладальніка ад прапінацыйнага права. Так, апекунам непаўналетніх уладальнікаў маёнтка Азярніца Слонімскага павета было прызначана 3800 руб., уладальнікам мястэчка Высока-Літоўск (Брэсцкі павет) – 30 тыс. руб., мястэчка Цэханаў (Бельскі павет) – 40 тыс. руб [8, арк. 32, 144, 160].

На працягу 1897–1901 гг. на выплату кампенсацый за адмену права прапінацыі было выдаткавана 26,13 млн руб., а да 1904 г. – 34 млн руб. [9, с. 17]. Сумы былі дастаткова вялікімі. Так, выплаты па Высока-Літоўску адпавядалі гадавой дзяржаўнай датацыі Гродзенскаму губернскаму камітэту папячыцельства аб народнай цвярозасці ў першыя гады яго існавання. Іх памер сведчыць аб жаданні ўлад падтрымаць прадстаўнікоў дваранства, фінансавыя інтарэсы якіх закраналіся піцейнай рэформай, як галоўную апору ўлады ў грамадстве. Кампенсацыя іншым прадстаўнікам грамадства, такім як уладальнікі корчмаў, сярод якіх значную частку складалі яўрэі, не прадугледжвалася. Але здараліся выпадкі, калі і дваране не маглі атрымаць вызначаную камісіяй суму. Так, С. Растоўцаву, уладальніку мястэчка Волчын (Брэсцкі павет), камісія першапачаткова вызначыла суму кампенсацыі ў 9 тыс. руб., але ён яе так і не атрымаў. 14 ліпеня 1910 г. сума была павялічана да 10 244 руб., але Міністэрства фінансаў адмяніла выплату. Справа дайшла да Сената і 17 лютага 1914 г. была накіравана на перагляд. Канчатковае рашэнне было прынята толькі ў студзені 1917 г., калі камісія пастанавіла выплаціць кампенсацыю з прычыны смерці С. Растоўцава яго нявестцы, якая пражывала ў г. Тамбове, але ці паспела яна атрымаць грошы, невядома [10, арк. 322–324].

Мінская часовая прапінацыйная камісія ў 1897–1907 гг. разглядала справы аб кампенсацыі як дзейсным, так і былым уладальнікам Хойнікаў, Узды, Кажан-Гарадка, Петрыкава, Глуска, Беразіно, Лагойска, Любані, Вузлянаў, Грэска, Ляхавічаў, Старобіна і Лоева [11].

Міністэрства фінансаў падтрымлівала меркаванне, згодна з якім ўзровень спажывання алкаголю не залежыць ад колькасці кропак продажу, у выніку чаго была створана шырокая сетка крам і ўстаноў. Іх колькасць вызначалася трохгадовым планам, які прымаўся Галоўным упраўленнем неакладных збораў і казённага продажу піцей, пасля ўзгаднення з папячыцельствам аб народнай цвярозасці. Замест ліквідаваных корчмаў ствараліся казённыя вінныя крамы, ці манапалькі, якія прадавалі гарэлку выключна навынас. Продаж ажыццяўляўся толькі за грошы, браць за гарэлку рэчы, прадукты, даваць у доўг забаранялася. Для забеспячэння манаполек у паветах ствараліся вінныя склады. Стварэнне густой сеткі манаполек спрыяла насычэнню рынка легальным алкаголем, што павінна было знізіць попыт і зрабіць вытворчасць алкагольных сурагатаў нерэнтабельным заняткам.

Колькасць манаполек у губерні зацвярджалася міністрам фінансаў і вызначалася памерам насельніцтва і статусам населенага пункта. Манапалькі адкрываліся ў гарадах, мястэчках, паселішчах, якія мелі прамысловае і гандлёвае значэнне. Так, згодна з планам на размеркаванне кропак продажу піцей на 1910–1912 г. у Мінскім павеце дзейнічала 69 манаполек (з іх 20 – у Мінску) і 22 карчмы (11 – у Мінску, пры наяўнасці яшчэ 3 патэнтаў, 2 – у Ракаве, па 1 – у Астрашыцкім Гарадку, Койданаве, Негарэлым, Заслаўі, Івянцы і Самахвалавічах) [12, арк. 45–50]. Сельская мясцовасць была цалкам пазбаўлена корчмаў і арыентавалася на вынасны гандаль, што, у сваю чаргу, вяло да змен у культуры спажывання алкаголю (вулічнае п'янства, адсутнасць закускі) і спрыяла развіццю арганізацыі таемных корчмаў з-за адсут-

насці легальных месцаў спажывання алкаголя, адпачынку і харчавання [13, с. 82].

Адказна падыходзілі і да выбару сядзельцаў манаполек – гандляроў, якія павінны былі быць «цвярозымі і ва ўсіх адносінах добранадзейнымі» [1, с. 39]. Былыя ўладальнікі корчмаў да гэтай працы не дапускаліся. Больш таго, улады пільна сачылі за далейшымі заняткамі гэтай катэгорыі людзей. Аб сітуацыі на месцах павінны былі дакладаць павятовыя папячыцельствы аб народнай цвярозасці. Напрыклад, Лідскае павятовае папячыцельства ў 1898 г. так апісвала дзейнасць асоб, якія займаліся продажам гарэлкі да ўвядзення манаполіі: «Некоторые из них занялись лесным, извозным и сапожным промыслом, некоторые хлебопашеством, мелочной торговлей, портняжеством, подёнными работами, убоем скота и перекупками, а некоторые занялись подпольной адвокатурой или выехали неизвестно куда» [14, арк. 33–34]. Лепшымі кандыдатамі ў сядзельцы казённых «вінных» крам лічыліся жанчыны, прысутнасць якіх павінна была прысаромець і стрымліваць пакупнікоў. Згодна з данымі за 1902 г., па Расійскай імперыі жанчыны ў сярэднім складалі 25 % сядзельцаў казённых крам, пры гэтым 13–14 % з іх мелі сярэднюю і вышэйшую адукацыю, тады як сярод мужчын гэты паказчык складаў менш за 1,5 % [9, с. 106]. Па чацвёртай акрузе Магілёўскай губерні у другой палове 1904 г. працавалі 53 сядзельцы, з іх 11 жанчын (20,75 %) (пераважна дваранкі і дочкі святароў). Для жанчын месца сядзельца ў манапольцы ў сямі выпадках з адзінаццаці з’яўлялася першым месцам работы і магчымасцю зарабляць грошы, што спрыяла іх эмансіпацыі [15, арк. 25–32].

Нягледзячы на тое, што асноўны гандаль гарэлкай ішоў у манапольках, цалкам ліквідаваць прыватныя піцейныя ўстановы не планавалася. Захаванне некаторай колькасці корчмаў было неабходна для арганізацыі харчавання і начлегу грамадзян. За прыватным сектарам заставаўся і гандаль напоямі, на якія не распаўсюджвалася манаполія, – у першую чаргу півам, мёдам, вінаградным вінам. Праз прыватныя прадпрыемствы рэалізоўвалася і частка «казённага віна» – не больш за 10 % ад агульнай колькасці.

Праваднікамі дзяржаўнай палітыкі ў сферы рэгулявання алкагольнага рынку і распаўсюджвання ідэі памеранага спажывання алкагольных напояў сталі губернскія і павятовыя камітэты папячыцельства аб народнай цвярозасці. Яны валодалі дастаткова шырокімі паўнамоцтвамі і прадстаўлялі сабой дзяржаўна-грамадскія арганізацыі. Асноўнай праблемай пры арганізацыі папячыцельстваў на тэрыторыі беларускіх губерняў з’явіўся падбор іх членаў.

Колькасны і сацыяльны склад папячыцельстваў аб народнай цвярозасці беларускіх губерняў меў пэўныя асаблівасці. У параўнанні з іншымі рэгіёнамі імперыі, дзе існавала «вінная» манаполія, тут назіраўся самы высокі паказчык колькасці ўчастковых папячыцелей – 44 чалавек у 1900 г. пры сярэднім паказчыку 27 чалавек. Сярод іх на першым месцы па колькасці стаялі святары (22,6 % пры сярэднім паказчыку 16,3 %). У той жа час назіралася даволі нізкая колькасць членаў-спаборнікаў – 71 чалавек у 1900 г. пры сярэднім 96 чалавек. Сярод спаборнікаў пераважалі чыноўнікі 22 % (пры сярэднім 12,7 %), святары – 17,6 % (пры сярэднім 16,2 %) і настаўнікі – 17,2 % (пры сярэднім

12,7 %). Колькасць асоб, якія не займалі дзяржаўныя ці грамадскія пасады, сярод членаў камітэтаў складала 28,5 % (пры сярэднім 46,4 %) [16, с. 11–12].

Першапачатковая колькасць членаў папячыцельстваў была даволі значная, але ў хуткім часе пачала змяншацца. Калі ў Магілёўскай губерні ў пачатку 1899 г. налічвалася 1187 членаў-спаборнікаў, то ўжо ў канцы года – 677. У далейшым гэта колькасць працягвала змяншацца і ў 1903 г. склала 302 чалавека [17, с. 3]. Сярод асноўных прычын скарачэння колькасці ўдзельнікаў справаздачы папячыцельстваў называлі змену месца жыхарства, адсутнасць вольнага часу і грашовых сродкаў, а таксама адсутнасць земскіх органаў самакіравання. Акрамя спісу жадаючых прыняць удзел у рабоце камітэта, губернскія папячыцельствы разглядалі яшчэ і «Списки лиц, которые могут быть привлечены к деятельности комитета», якія складаліся павятовымі спраўнікамі. На практыцы гэтыя спісы маглі карэнным чынам не супадаць. Далейшае зніжэнне колькасці членаў папячыцельстваў было звязана з фармалізацыяй працы гэтых устаноў [18, с. 238, 242].

Такім чынам, рашэнне расійскіх улад аб увядзенні «віннай» манаполіі выклікала карэнныя змены ў структуры гандлю моцнымі напоямі. Значныя сумы былі накіраваны на кампенсацыю памешчыкам за адмену права прапінацыі. Была створана сетка дзяржаўных крам, а перад уладамі паўстала пытанне пошуку памяшканняў і персанала для іх сярод асоб хрысціянскага веравызнання. Асаблівая ўвага надавалася прыцягненню да гандлю жанчын. Яўрэйскае насельніцтва, якое валодала значнай колькасцю піцейных устаноў, што падлягалі ліквідацыі ці змене спецыялізацыі, да гандлю гарэлкай не дапускалася і трапляла пад нагляд улад. Пры арганізацыі папячыцельстваў аб народнай цвярозасці ўлады планавалі зрабіць стаўку на лаяльныя сацыяльныя групы і абмяжоўвалі грамадскую ініцыятыву. Гэта, з аднаго боку, выклікала бюракратызацыю папячыцельстваў і знізіла эфектыўнасць іх дзейнасці, а з другога – зніжэнне інтарэса да папячыцельстваў з боку насельніцтва.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Казённая продажа вина / изд. Гл. Упр. Неоклад. сборов и казён. продажи питей. – СПб., 1900. – 228, [252] с.

2. Из истории борьбы за трезвость на Гроденщине / Правление Гродн. обл. организации об-ва «Знание», Правление Гродн. обл. организации доброволь. об-ва любителей книги, Гродн. обл. совет доброволь. об-ва борьбы за трезвость. – Гродно, 1986. – 16 с.

3. *Фридман, М. И.* Винная монополия: винная монополия в России / М. И. Фридман. – Петроград, 1916. – Т. 2. – 681 с.

4. *Николаев, А. В.* Борьба с пьянством и алкоголизмом в 1894–1932 гг.: опыт отечественной истории: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / А. В. Николаев; Самар. гос. пед. ун-т. – Самара, 2002. – 20 с.

5. *Канель, В. Я.* Алкоголизм и борьба с ним / В. Я. Канель. – М.: Тип. т-ва И. Д. Сытина, 1914. – 532 с.

6. *Цитович, П.* Питейная монополия помещиков Польши в своих имениях / П. Цитович. – СПб.: Тип. В. Ф. Киршбаума, 1907. – 379 с.

7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна (далей – НГАБ у Гродна). – Ф. 1172. Воп. 1. Спр. 2.

8. НГАБ у Гродна. – Ф. 30. Воп. 1. Спр. 166.

9. *Норов, В.* Казенная винная монополия при свете статистики. Ч. 2. Финансовые результаты винной монополии. Организация винного хозяйства / В. Норов. – СПб.: Тип. Н. Н. Клобухова, 1905. – [2], 119, [1] с.

10. НГАБ у Гродна. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 2165.

11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 90. Воп. 1. Спр. 1–10.

12. НГАБ. – Ф. 132. Воп. 1. Спр. 14.

13. *Мяньчэня, С. В.* Сацыяльныя аспекты пашырэння п'янства на тэрыторыі беларускіх губерняў у пачатку XX ст. / С. В. Мяньчэня // Сахаровские чтения 2018 года: экологические проблемы XXI века: материалы 18-й междунар. науч. конф., 17–18 мая 2018 г., г. Минск, Респ. Беларусь: в 3 ч. / Междунар. гос. экол. ин-т им. А. Д. Сахарова Белорус. гос. ун-та; редкол.: А. Н. Батян [и др.]; под ред. С. А. Маскевича, С. С. Позняка. – Минск: ИВЦ Минфина, 2018. – Ч. 1. – С. 81–82.

14. НГАБ у Гродна. – Ф. 1542. Воп. 1. Спр. 1.

15. НГАБ. – Ф. 2162. Воп. 1. Спр. 46.

16. *Тушинский, Д. А.* Попечительства о народной трезвости в 1901 г. / Д. А. Тушинский. – СПб., 1904. – 34,45, 31 с.

17. Отчёт о деятельности Могилёвского попечительства о народной трезвости за 1903 год. – Могилёв, 1904. – 47 с.

18. *Меньченя, С. В.* Структура и социально-конфессиональный состав комитетов попечительства о народной трезвости в латышских уездах Витебской губернии в 1897–1914 годах / С. В. Меньченя // Vesture: avoti un cilveki. XXVI zinatniskie lasnjumi. Vesture XX. – Daugavpils: Daugavpils Universitates Akademiskais apgads «Saule», 2017. – С. 235–244.

**(Дата паступлення: 09.02.2022).**